УДК 947.6(075.8)
ББК 63.3(4Бел)я73
К666

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ,
рэкамендавана секцыяй гуманітарных навук БДПУ
(пратакол № 7 ад 29.03.05)

*Рэцэнзенты:*
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *А. П. Жытко;*
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры новай і навейшай гісторыі БДПУ *П. А. Тупік*

**Корзюк, А. А.**
К666 Шляхі фарміравання пазнавальнага інтарэсу вучняў у працэсе вывучэння гісторыі Беларусі ў школе (канец XVIII – пачатак XX ст.) : метад. дапам. / А. А. Корзюк; пад навук. рэд. І. І. Баргановіча. — Мн. : БДПУ, 2005. — 47 с.

У дапаможніку прапанаваны разнастайныя варыянты ўрокаў, змешчаны праблемныя заданні. Даюцца фрагменты з твораў мастацкай літаратуры. Выкарыстаны вопыт вывучэння ваенна-гістарычнага і культурна-гістарычнага матэрыялаў.
Адрасуецца студэнтам гістарычнага факультэта БДПУ.

УДК 947.6(075.8)
ББК 63.3(4Бел)я73

© Корзюк, А. А., 2005
© ВВЦ БДПУ, 2005

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

**А. А. Корзюк**

# ШЛЯХІ ФАРМІРАВАННЯ ПАЗНАВАЛЬНАГА ІНТАРЭСУ ВУЧНЯЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ШКОЛЕ (КАНЕЦ XVIII – ПАЧАТАК XX ст.)

*Метадычны дапаможнік*

8991
бібліятэка
БДПУ імя М. Танка

Мінск 2005

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Якія змены адбыліся ў сістэме адукацыі ў пачатку 19 ст.? Калі і ў сувязі з чым у ей адбыліся новыя рэформы?
- Чаму літаратура першай паловы 19 ст. называецца "новай"? Якія цяжкасці існавалі ў яе станаўленні?
- Якія дзеячы культуры, на ваш погляд, унеслі найбольш адметны ўклад у яе развіцце ў першай палове 19 ст. і чаму?

Абагульніўшы адказы вучняў, падвесці іх да разумення неабходнасці прааналізаваць змены і дасягненні ў развіцці беларускай культуры другой паловы 19 ст.

Пасля гэтага ў ходзе асноўнай часткі ўрока заслухоўваюцца паведамленні вучняў па загадзя падрыхтаваных тэмах, якія прыведзены вышэй. Пасля кожнага паведамлення вучні класа задаюць ім удакладняючыя пытанні.

Каб пераканацца ў тым, як вучні засвоілі праслуханы матэрыял, настаўнік можа прапанаваць ім пытанні для абмеркавання:

- Як адбівалася адсутнасць ВНУ на развіцці адукацыі і навукі ў Беларусі?
- Чаму ў Беларусі развіваліся пераважна гуманітарныя навукі?
- З якіх пазіцый асвятлялася навукоўцамі гісторыя і этнаграфія Беларусі?
- Чым было выклікана з'яўленне новых жанраў у беларускай літаратуры?
- Патлумачце паняцці: эклектыка, псеўдаготыка, візантыйскі стыль.

У канцы фармулюецца выніковы вывад аб тэндэнцыях у развіцці беларускай культуры на працягу 19 ст., які запісваецца вучнямі ў сшыткі.

У якасці хатняга задання вучням, акрамя §18-19, можна прапанаваць выканаць вусна або пісьмова пытанні 1-2 да §19 (4 узровень) і пісьмова заданне 4 да яго ж (5 узровень).

### Тэма "Газета "Наша Ніва" – цэнтр нацыянальна-культурнага адраджэння." (§ 29).

Магчымы два варыянты арганізацыі ўрока. Пры першым варыянце ўрок з'ўляецца камбінаваным, і ў яго першай частцы праводзіцца праверка хатняга задання па папярэдняму параграфу «Лютаўская рэвалюцыя ў Беларусі». Пры выкарыстанні другога–праводзіцца ўрок па вывучэнні новага матэрыялу пасля правядзення тэматычнага кантролю па раздзелах VIII-IX. У гэтым выпадку ў якасці хатняга задання на гэты ўрок вучням неабходна паўтарыць п. 3-4 §23.

На ўроку неабходна ахарактарызаваць беларускі адраджэнскі рух у пач. 20 ст., раскрыць бакі дзейнасці і ролю газеты "Наша Ніва" у ім і барацьбе з рускім і польскім нацыяналізмам.

Пры вывучэнні дадзенай тэмы настаўнік мае магчымасць працягнуць развіцце навыкаў самастойнай працы вучняў з падручнікам, фармулёўкі вывадаў і абагульнення матэрыялу, а таксама зрабіць пэўныя крокі ў выхаванні нацыянальнай самасвядомасці і годнасці вучняў, павагі да беларускай дзяржаўнасці, мовы, культуры.



У пачатку вывучэння новага матэрыялу мэтазгодна правесці актуалізацыю ведаў вучняў па матэрыялу, непасрэдна звязанаму з выданнем першых беларускіх легальных газет:

- Што разумеецца пад нацыянальна-вызваленчым рухам? У чым былі яго прычыны ўзнікнення ў Беларусі?
- З чым была звязана яго актывізацыя ў пач. 20 ст.?
- Калі выйшла, як называлася і колькі выходзіла першая беларускамоўная легальная газета?
- Калі пачала выходзіць газета "Наша Ніва"?
- Якая партыя стала ініцыятарам яе стварэння?
- Хто з дзеячоў беларускай культуры ўдзельнічаў у яе выданні?

Затым на аснове самастойнай пазнавальнай работы з падручнікам па выкананні вучэбных заданняў арганізуецца вывучэнне новага матэрыялу.

Вучні класа падзяляюцца на тры варыянты, кожны з якіх атрымлівае вучэбна-пазнавальнае заданне:

I. Вывучыць п.1-2 §29 і скласці праграму газеты "Наша Ніва" па палітычных, эканамічных і нацыянальна-культурных пытаннях, а пасля вылучыць і растлумачыць галоўны накірункі яе дзейнасці.

II. Вывучыць п.3 §29 і на падставе гэтага пабудаваць і растлумачыць схему "Нашаніўскае выдавецтва", і зрабіць свае вывады аб накіраванасці і ідэйным змесце газеты.

III. Вывучыць п.4-5 §29 і вызначыць цяжкасці ў нацыянальна-культурным руху на пач. XX ст., канкрэтныя заслугі ў ім "Нашай Нівы" і накірункі міжнародных сувязяў газеты.

Пасля завяршэння работы і заслухоўвання адказаў вучняў, фармулюецца ўрочны вывад аб ролі і месцы "Нашай Нівы" у гісторыі культуры і нацыянальнага адраджэння Беларусі.

Для развіцця навыкаў канспектавання і працы з дадатковай даведачна-інфармацыйнай літаратурай на дом, акрамя §29, можна прапанаваць вучням скласці кароткія нататкі пра нацыянальна-культурную дзейнасць аднаго з дзеячоў "Нашай Нівы" – братоў Луцкевічаў, В.Ластоўскага, А.Уласава, С.Палуяна і інш. (5 узровень).

### Тэмы "Адукацыя і навука. Друк. Бібліятэкі." (§30). "Літаратура. Тэатр і музыка. Жывапіс." (§31).

Праграма адводзіць на вывучэнне гэтых тэм па адной гадзіне на кожную, у сукупнасці – дзве гадзіны. Улічваючы пераемнасць і сугучнасць гэтых тэм з ужо вывучаным вучнямі матэрыялам па гісторыі беларускай культуры 19 ст. (§§7-9, 18-19), а таксама тое, што яе вывучэнне праходзіць у канцы навучальнага года, прапануецца арганізаваць яе вывучэнне наступным чынам. На першым уроку настаўнікам праводзіцца агляданая лекцыя па §30-31, у ходзе якой вучні складаюць



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

яе разгорнуты план, а на другім праводзіцца ўрок-гульня “Культура Беларусі ў пачатку XX ст.”, распрацоўка якога прапануецца ніжэй.

Урок будзе спрыяць пашырэнню, паўтарэнню і канкрэтызацыі ведаў вучняў пра асноўныя праявы, падзеі і дзеячоў беларускай культуры пачатку XX ст., а гульнявая форма яго правядзення дапаможа развіццю творчых інтэлектуальных здольнасцей вучняў, іх пазнавальнай актыўнасці, умення працаваць у камандзе, выхаванню таварыскіх адносін, пачуцця суперажывання, дапаможа стварыць сітуацыю поспеху.

Акрамя гульневых матэрыялаў, якія трэба падрыхтаваць загадзя, на ўроку пажадана выкарыстоўваць кнігі і выданні Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, Цёткі, В.Ластоўскага,

На пачатку ўрока пасля прывітання, настаўнік паведамляе вучням тэму і мэты ўрока, тлумачыць форму яго правядзення, пасля чаго вучні дзеляцца на 2-3 каманды па загадзя падрыхтаванаму плану на чале са сваімі капітанамі.

За кожны правільны адказ камандзе налічваецца 1 бал, няправільны – 0 балаў.

Гульня пачынаецца з выканання камандамі тэставых заданняў (кожнай камандзе прапануецца свая картка для выканання):

**Тэставая картка 1.**

1. Пачатковую адукацыю давалі:
   а) царкоўна-прыходскія школы;
   б) гарадскія вучылішчы;
   в) прагімназіі;
   г) рэальныя вучылішчы.
2. Аўтарам трохтомніка “Беларусы” з’яўляецца:
   а) М.Федароўскі;
   б) Е.Раманаў;
   в) Я.Карскі.
3. Першая кніга па гісторыі Беларусі – нарыс “Кароткая гісторыя Беларусі” быў апублікаваны В.Ластоўскім у:
   а) 1916;
   б) 1910;
   в) 1917.
4. Суаднясіце прозвішчы беларускіх пісьменнікаў і іх псеўданімы:

| | |
|---|---|
| а) Я.Купала | 1) А.Пашкевіч |
| б) Я.Колас | 2) К.Каставіцкі |
| в) К.Каганец | 3) І.Луцэвіч |
| г) Цетка | 4) К.Міцкевіч. |

5. У 1911 г. Алесь Бурбіс стварыў:
   а) Першае таварыства беларускай драмы і камедыі;
   б) Беларускі музычна-драматычны гурток;
   в) Першую беларускую трупу.



**Тэставая картка 2.**

1. Актыўным удзельнікам нелегальнага з’езду настаўнікаў у 1906 г. быў:
   а) Я.Купала;
   б) Я.Колас;
   в) М.Багдановіч.
2. Вывучэннем гісторыі ВКЛ у пачатку XX ст. займаўся:
   а) В.Ластоўскі;
   б) Е.Раманаў;
   в) М.Доўнар-Запольскі.
3. Папярэдняя цэнзура ў друку была ліквідавана:
   а) у 1905 г.;
   б) у 1906 г.;
   в) у 1913 г.
4. Суаднясіце імены пісьменнікаў і назвы іх зборнікаў:

| | |
|---|---|
| а) Я.Купала | 1) “Скрыпка беларуская” |
| б) Я.Колас | 2) “Шляхам жыцця” |
| в) Цетка | 3) “Вянок” |
| г) М.Багдановіч | 4) “Песні жальбы”. |

5. Прызнаным майстрам пейзажнага жывапісу у пачатку XX ст. з’яўляўся:
   а) Я.Кругер;
   б) Ю.Пэн;
   в) В.Бялыніцкі-Біруля.

Пасля падвядзення вынікаў 1 конкурса камандам задаюцца пытанні для кароткіх вусных адказаў (для каманднага абмеркавання) на працягу 30 – 40 секунд:

1. Што такое “тэорыя афіцыйнай народнасці”?
2. Хто называўся “дарэктарам”? Хто з беларускіх пісьменнікаў навучаўся ў іх?
3. Назавіце самую буйную бібліятэку ў Беларусі.
4. Назавіце дарэвалюцыйныя паэмы Я.Купалы.
5. Хто быў стваральнікам Першай беларускай трупы?
6. Якія жанры жывапісу былі найбольш распаўсюджанымі ў пач. XX ст.?
7. Назавіце галоўныя тэмы творчасці М.Багдановіча.
8. Чаму беларуская літаратура пач. XX ст. называецца “нашаніўскай”?

Затым праводзіцца конкурс капітанаў каманд, якім прапануецца на выбар 2 заданні:

а) прачытаць на памяць верш аднаго з беларускіх паэтаў пач. XX ст.; або
б) вызначыць аўтарства прапанаваных урыўкаў з наступных вершаў:
- “Слуцкія ткачыхі”, “Раманс”, “Пагоня” М.Багдановіча;
- “Ворагам беларушчыны”, “Роднае слова”, “Маладая Беларусь” Я.Купалы;
- “Родныя вобразы”, “Мужык” Я.Коласа.

Завяршае ўрок-гульню мастацкае творчае заданне:



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ